ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ДВАРЭЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

# Гульня-падарожжа
# “Фальклорная мазаіка”

Падрыхтавала:
Класны кіраўнік IV класа
Азеева Вераніка Уладзіміраўна
12.12.2019 г.

2019 г.

**Дата правядзення:** 12 снежня 2019

**Клас:** IV

**Класны кіраўнік:** Азеева Вераніка Уладзіміраўна

**Месца правядзення:** кабінет 4 класа

**Час правядзення** 14.00 – 15.00

**Тэма:** “Фальклорная мазаіка”

**Форма:** гульня-падарожжа

**Мэта:**выхаванне любві і павагі да родный мовы.

**Задачы:**

1. замацаваць веды аб беларускім народным фальклоры: прымаўках, прыказках, загадках, казках і г.д.;

2. развіваць мову вучняў, узбагачаць слоўнікавы запас;

3. выхоўваць любоў і павагу да роднага слова праз знаёмства са спадчынай беларускага народа.

**Афармленне, абсталяванне**: камп’ютар, кніжная выстава, карткі з скорагаворкамі, аўдыёзапісы.

## План правядзення

### I. Арганізацыйны момант

*Гучыць народная музыка (мінусоўка).*

- Добры дзень, паважаныя сябры! Наша сённяшняя сустрэча прысвечана самаму значнаму скарбу чалавека – роднай мове.

- Мова – душа народа, векавая памяць многіх пакаленняў, наш галоўны нацыянальны скарб. Жыве мова – жыве народ, жыве памяць продкаў. Няма роднай мовы – няма народа, няма суцяшэння ў горы, няма слоў радасці.

- Ці доўга пражыве дрэва, калі ў яго абсякуць карані і якім стане чалавек, калі ў яго забяруць родную мову? І сёння гонар і абавязак усіх нас - шанаваць родную мову. Вось чаму многія беларускія пісьменнікі і звяртаюцца да нас,

беларусаў, каб мы не цураліся роднага слова, а размаўлялі на роднай беларускай мове.

- Сёння мы з вамі будзем размаўляць на беларускай мове, якую пяшчотна называем роднай, матчынай. Перасяленцы з іншых краін прынеслі з сабой сваю мову – русскую, польскую, украінскую, але нашай мовай застаецца беларуская. Роднае слова з’яўляецца адным з самых вялікіх здабыткаў кожнага народа. Яго з пашанай называюць люстэркам культуры.

- Нашы продкі пакінулі нам багатую духоўную спадчыну — **вусную народную творчасць**, якую яшчэ называюць **фальклорам**. За стагоддзі сваёй гісторыі беларускі народ стварыў багацейшую духоўную спадчыну –казкі, песні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, прыкметы і павер’і і г.д. І зараз мы з вамі адправімся ў падарожжа, дзе вас чакаюць цікавыя заданні.

**II. Асноўная частка.**

1. Прыпынак «Прыказкі і прымаўкі».

- У багацейшай фальклорнай скарбніцы беларусаў прыказкі і прымаўкі займаюць асобае месца. Гэта шматвяковы жыццёвы і працоўны вопыт, мудрасць народа, яго погляды на сусвет, прыроду, сямейныя ўзаемаадносіны, працу, асабліва на земляробства, -словам, на ўсё, з чым сутыкаўся і сутыкаецца чалавек у розныя гістарычныя перыяды.

*Напрыклад:*

- Старасць не радасць.
- Як кот наплакаў.
- У родным краі, як у раі.
- Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж.

- Давайце будзем працаваць ды прымаўкі ўспамінаць! Прадоўжыце беларускія прыказкі і прымаўкі.

Хочаш добра жыць … *павінен працу любіць.*

Гультай за дзела … *мазоль за цела.*

Чалавек без працы, … *што птушка без крылаў.*

Гусі нізка … *зіма блізка.*

Чаго не ясі, таго ... *ў рот не нясі.*

Няма смачнейшай вадзіцы, як … *з роднае крыніцы.*

Ваўка ногі ... *кормяць.*

Што пасееш ... *тое і вырасце (пажнеш).*

Хто працуе, … *той не сумуе.*

Посуд чысціню ... *любіць.*

Ад працы рукі ... *не сохнуць.*

Ад ляноты ... *чакай бядоты.*

Без навук,... *як без рук.*

Дзе коратка, ... *там і рвецца.*

За дурной галавой ... *нагам неспакой.*

Каб конь добра вёз, ... *давай яму авёс.*

Мокры чалавек … *даджу не баіцца.*

У родным лесе і … *куст родны.*

Як працуеш, … *так і маеш.*

- Вельмі добра, малайцы! І мы зноў адпраўляемся ў дарогу.

2. Прыпынак **"Загадкі".**

**Загадка** – гэта вобразнае апісанне ўтоенага прадмета ці з'явы, якое патрабуе разгадкі.

- Загадкі з'уляюцца адным са старажытных відаў народнай творчасці. Чалавек складваў загадкі пра тое, з чым ён сустракаўся ў жыцці, дома, на працы, у час адпачынку. Яго асабліва цікавілі з'явы прыроды, бо ад іх залежыў ураджай і дабрабыт народа. Імкнуючыся пазнаць іх, чалавек параўноўваў загадкавае з добра знаёмым, з відавочным.

- Я буду вам загадваць загадку, а хто ведае, падымае руку і адказвае. Але памятайце, што адказы прымаюцца толькі на беларускай мове. Пачынаем….

У вадзе купаўся, ды сухім застаўся. *(Гусь)*

Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб’е, той кроў пралье. *(Камар)*

Назбіралі арэхаў пяць мяшкоў,
Насушылі грыбоў 120 карабоў.
Нацягалі шышак горку,
Працавітыя ... *(Вавёркі)*

Дзяцел з ночы быў сярдзіты,
Тэлеграму пераблытаў,
І пайшла па лесе байка;
“З’еў лісіцу шэры ... ”. *(Зайка)*

Белы, да не цукар, ног няма, а ідзе. *(Снег)*

Без кораня, а расце. *(Камень)*

Без ног бяжыць, без воч глядзіць. *(Вада)*

Лата на лаце, ніткі не знаці. *(Капуста)*

Цераз мяжу брат брата не бачаць. *(Вочы)*

Рук многа, а нага адна. *(Дрэва)*

Стаяць слупы бялёныя, на іх шапкі зялёныя. *(Бярозы)*

На полі Ярох рассыпаў гарох, стала світаць – няма чаго збіраць. *(Неба і зоркі)*

Без голасу, а вые, без рук, а абрусы сцеле. *(Завіруха)*

Белы, а не цукар, без ног, а ідзе. *(Снег)*

Цераз палі, цераз лугі спусціліся канцы дугі. *(Вясёлка)*

Махнула птушка крылом, накрыла увесь свет пяром. *(Ноч)*

Хоць у капялюшы, а галавы не мае. *(Грыб)*

Вырас куст, у кусце домікі, а у доміках дзеткі. Павеяў вецер, домікі разваліліся, а дзеткі пакаціліся. *(Гарох)*

Нітак многа, а ў клубок не зматаеш. *(Павуцінне)*

Рагаты, а не бык, ежу бярэ, а не сыты, людзям падае, а сам у кут ідзе.

*(Відэлец)*

Белае поле, чорнае насенне, хто яго сее, той разумнее. *(Кніга, пісьмо)*

Фыркае, рыкае, галіны ламае, цябе з ног збівае; чуеш яго, ды не бачыш. *(Вецер)*

- А зараз – **загадкі-падманкі**!!! Будзьце вельмі ўважлівыя, не заўсёды адказ у рыфму з’яўляецца правільным!

Хто грызе на ёлцы шышку?

Ну, вядома, гэта … мішка? (*Вавёрка!)*

У куратніку йдзе бойка!

Хто завёў яе? Два … воўка? *(Пеўня!)*

Вельмі павольна і ціха

Паўзе … зайчыха? *(Слімак!)*

Парушаючы раніцай ціш,

Спявае ў гаі ….. мыш? *(Салавей!)*

- Вельмі добра, вам спадабаліся загадкі. Адпраўляемся далей.

3. Прыпынак **“Прыкметы”**

- А мы тым часам набліжаемся да станцыі **“Прыкметы”.**

**Прыкметы** – гэта трапныя народныя выслоўі, у якіх прадказваецца пэўны вынік, пацверджаны народным вопытам. Працей кажучы, людзі назіраюць, заўважаюць і робяць пэўныя вынікі. А хто з вас ведае прыкметы? *(Адказы дзяцей).* Добра, малайцы! А зараз паспрабуйце здагадацца, пра якую прыкмету пойдзе размова.

Май даждлівы - *год урадлівы. (Будзе добры ўраджай.)*

Вераб’і сядзяць, нахмурыўшыся - *хутка будзе дождж.*

Жураўлі ляцяць высока - *зіма яшчэ далёка.*

Жураўлі ляцяць нізка - *зіма ўжо блізка.*

Моцна парыць - *на дождж.*

Расліны закрываюць кветкі - *да дожджу.*

Яркія зоркі - *да пагожага дню.*

Калі ластаўкі і стрыжы лятаюць высока - *будзе добрае надвор'е.*

4. Прыпынак **"Казкі"**

- Наша падарожжа працягваецца, мы набліжаемся да станцыі "Казкі".

**Казка** – гэта апавяданне фантастычнага або бытавога зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу. Казкі па жанрах падзяляюцца на тры віды, якія? Хто ведае? *(Адказы дзяцей.)*

- Правільна! Казкі пра жывёл, бытавыя, чарадзейныя. А зараз будзьце ўважлівы, зноў да вас пытанні!

Ад якога слова паходзіць слова "казка"? *(Казаць)* Так, таму што казкі перадаваліся вусна, расказваліся.

Чым народныя казкі адрозніваюцца ад літаратурных? *(Аўтарствам)*

У якіх казках дзейнічаюць Ліса, Воўк, Мядзведзь*? (У казках пра жывёл)*

Якімі словамі звычайна пачынаюцца казкі? *(Жылі-былі)*

Якая жывёла ў казках азначае хітрасць? *(Ліса)*

Якая жывёла ў казках азначае баязлівасць? *(Заяц)*

Якая жывёла ў казках азначае ўпартасць? *(Баран)*

5. Прыпынак **"Скорагаворкі"**

- Апошні наш прыпынак для тых, хто вельмі любіць гаварыць – **"Скорагаворкі."** Вам трэба хутка і правільна прагаварыць скорагаворку. (Дзецям раздаюцца карткі з скорагаворкамі.)

- Тры сяброўкі, тры вавёркі у траіх вілі вяроўкі.

- Барабаншчык Баран бараніў барабан.

- Зубраня зубрыла ўрок, вызубрыла на зубок.

- На двары стары баран грукаў зранку ў барабан.

- Белы бусел баіў байку шэраму зайку.

- Боб ды боб – два бабы, а яшчэ боб – тры бабы.

- Вадавоз вёз ваду ад вадаправода.

- Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі.

- Добра ўсюды добраму. Добраму ўсюды добра.

- Ехаў грэка цераз рэку, бачыць грэка ў рацэ – рак, грэка руку ў рэку ўсунуў, рак за руку грэку – цап!

- Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравіну.

- Каласы каласавалі, выкаласаваліся.

- Карл у Клары ўкраў каралы.

- Лянок не любіць лянот, лянот не любіць лянок.

- Лаўрэн лавіў рыбу, Лара варыла рыбу з лаўровым лістом.

- Маша шыла шапку Сашу. Шапку Сашу шыла Маша.

- Скача чапля па балоце, чачотачка ў чароце, а чубаты чачот топча, топча агарод.

- Ткач ткаў хустку на таку і хукаў на руку.

III. Падвяддзенне вынікаў

- Малайцы! Наша падарожжа скончылася, спадзяюся, што вам спадабалася. Да пабачэння!

А вы, дзеткі нашы, дружна жывіце,
Хутка расціце,
Край свой любіце,
На роднай мове часцей гаварыце!